**ВОДЗЫЎ**

афіцыйнага апанента на дысертацыю **Калтачэнка Аліны Ігараўны**
**"Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст."**,
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны**

Змест дысертацыйнага даследавання Калтачэнка А. І. "Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст." адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне навукі – гістарычныя, у адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацверджаным ВАК Рэспублікі Беларусь.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Праблематыка адукацыйных падарожжаў ужо мае сваю традыцыю даследаванняў у беларускай, польскай, расійскай гістарыяграфіях. У меншай ступені да гэтай тэмы звярталіся літоўская і ўкраінская гістарыяграфія. Пераважна разглядаліся адукацыйныя падарожжы асобных родаў. У беларускай і польскай гістарыяграфіях акцэнт рабіўся на XVI – XVII стст. Для расійскай гістарыяграфіі ў праблематыцы адукацыйных падарожжаў актуальным застаецца перыяд XVIII ст. Што тычыцца гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, то абагульняючай працы па еўрапейскай адукацыі прадстаўнікоў эліт XVI–XVIII ст. напісана яшчэ не было.

Між тым, у XVI ст. пасля вялікіх палітыка-адміністратыўных і сацыяльна-эканамічных рэформ адбывалася станаўленне новага дзяржаўнага апарату, а ў палітычнае жыццё уваходзілі публічныя дыскусіі і набыла значнасць рыторыка. Гэтыя тэндэнцыі запатрабавалі ад эліт XVI — першай паловы XVII стст. станаўлення новых культурных практык і наставіла перад імі як пытання адукаванасці, так і фармавання стылю камунікацыі. Адукацыйныя падарожжы сталі адной з формаў адказу на такія выклікі.

На працягу трох стагоддзяў гэтая практыка не была статычнай па сваёй форме. Задача прааналізаваць станаўленне, развіццё і трансфармацыю з'явы адукацыйных падарожжаў з'яўляецца актуальнай для айчыннай гістарыяграфіі з перспектывы аналіза фармавання апарата дзяржавы і станаўлення эліты як сацыяльнага пласта ў Вялікім Княстве Літоўскім XVI—XVIII стст.

**Ступень навізны вынікаў, якія атрыманыя ў дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

У дысертацыі комплексна разглядаюцца розныя этапы адукацыйных падарожжаў эліт Вялікага Княства Літоўскага ў XVI—XVIII стст. Гэта дазволіла ахарактарызаваць тыя змены, якія адбываліся на працягу ўказаных стагоддзяў у арганізацыі адукацыйных падарожжаў. Падобны комплексны аналіз для ўсяго пазначанага перыяду быў праведзены ўпершыню.

Распрацоўка тэматыкі дысертацыі суправаджалася выяўленнем новых архіўных матэрыяллаў, што дазволіла рэканструяваць адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага з роду Сапегаў і Радзівілаў. Вядзенне дыярыушаў падарожжаў характарызуецца як адна з рысаў і адметнасцяў адукацыйных падарожжаў.

Апроч таго, дысертант звязала станаўленне такіх новых практык эліт Вялікага Княства Літоўскага, як адукацыйныя падарожжы, з транфармацыямі і рэформамі ўніверсітэтаў у Заходняй Еўропе, з працэсамі іх секулярызацыі і "аддзяржаўлення" у кантэксце палітыкі канфесіяналізацыі. Такім чынам, была прапанавана перыядызацыя размежавання практык «peregrinatio academica», ці «навуковую перэгрынацыю» і «grand tour», ці «гранд тур». У больш шырокім кантэксце, дысертацыя характарызуе сітуацыю культурнага транзіту ў Еўропе XVI—XVIII стст.

У канцэнтраваным выглядзе тэарэтычныя палажэнні і эўрыстычныя знаходкі знайшлі сваё адлюстраванне палажэннях, якія выносяцца на абарону.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца самастойна выкананай працай, якая мае сваю ўнутраную лагічную структуру. Дысертант праявіла творчы падыход пры напісанні працы.

Для дасягнення мэты даследавання аўтар дысертацыі фармулюе канцэпцыю ўзаемасувязі трансфармацыі дзяржаўнага ладу ВКЛ і ўплыву на яе адукацыйных фактараў. Дысертант аналізуе сітуацыю, калі пасля надыходу эпохі Рэнесансу адбыліся кардынальныя змены дзяржаўнага кіравання у ВКЛ, якія патрабавалі новых ведаў і новых падыходаў да адукацыі. Адначасова на землях Свяшчэннай Рымскай імперыі пачалі ўзнікаць навучальныя ўстановы новага тыпу, якія прапаноўвалі зусім іншыя ўзоры навучальных праграм. Гэта і стала перадумовай узнікнення з'явы замежных адукацыйных падарожжаў.

У сваім даследавнні дысертант абапіралася на наяўную гістарыяграфію праблемы, адзначаючы спрэчныя пытанні і нераспрацаваныя сюжэты. Адначасова даследчык прыцягнула шырокі корпус апублікаваных і архіўных крыніц, у тым ліку выяўленых самастойна. Былі ўлічаны таксама звесткі з матрыкул заходнеўрапейскіх універсітэтаў. Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і палажэнняў, сфармуляваных у дысертацыі, падмацавана аналізам шырокага кола гістарычных крыніц.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі Калтачэнка А. І. заключаецца ў тым, што яны дазваляюць разглядаць унутраныя працэсы сярод эліт Вялікага Княства Літоўскага ва ўзаемасувязі са знешнімі адукацыйнымі практыкамі, выбудоўваць сувязь паміж сацыяльнымі і культурна-адукацыйнымі працэсамі.

Практычная значнасць. Матэрыялы і высновы даследавання могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі агульных і спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі, а таксама ўсеагульнай гісторыі ў вышэйшых навучальных установах; пры напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі.

Напрацаваны аўтарам матэрыял выкарыстоўваецца кафедрай сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у турызме і гасціннасці Інстытута менеджменту спорту і турызму установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры».

Асобны кірунак – выкарыстанне матэрыялаў і высноваў працы для ствярэння дапаможнікаў па гісторыі падарожжаў і турызму. Вынікі даследавання ўжо ляглі ў аснову вучэбнага дапаможніка «Гісторыя падарожжаў і турызму» для навучэнцаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі (2022 г.).

Эканамічная значнасць. Матэрыялы дысертацыі Калтачэнка А. І. могуць выкарыстоўвацца для распрацоўкі і рэалізацыі навучальных праграм адукацыйных курсаў, у тым ліку для забеспячэння пазабюджэтных сродкаў тустановы адукацыі. Таксама матэрыялы дысертацыі могуць паняхова выкарыстоўвацца беларускай турыстычнай сферай, як унутры Беларусі, так і па-за яе межамі.

Сацыяльная значнасць. Дысертацыйнае даследаванне спрыяе захаванню гістарычнай памяці з улікам усёй супярэчлівасці гістарычнага працэсу. Адначасова яно сведчыць пра адкрытасць грамадства ў нашай айчыннай гісторыі, не прымання канцэпцыі ізаляцыі.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі былі апублікаваны ў 6 навуковых артыкулах у выданнях, якія ўключаны ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (3,9 аўт. л.). Апроч таго, маецца 8 публікацый у айчынных і замежных выданнях (3,4 аўт. л.), 9 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый (3,2 аўт. л.). Таксама быў падрыхтаваны раздзел у навучальным дапаможніку для навучэнцаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі (1,4 аўт. л.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 11,9 аўтарскіх аркушаў. Разам – 24 публікацыі дысертанта. Асноўныя палажэнні дысертацыі абгрунтаваны ў апублікаваных артыкулах.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Афармленне дысертацыі адпавядае інструкцыі ВАК Рэспублікі Беларусь ад 28.02.2014 г. Прысутнічаюць усе структурныя часткі, абумоўленыя мэтамі і задачамі дысертацыі: уводзіны, агульная характарыстыка працы, чатыры главы, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц, дадаткаў. У дысертацыі ёсць спасылкі на даследаванні і крыніцы, якія былі выкарыстаныя суіскальнікам, а таксама на ўласныя публікацыі, у якіх прадстаўлены асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання.

**Заўвагі па дысертацыі (пры іх наяўнасці), калі яны не ўказваюцца ў структурных элементах водгука**

1. Асобныя тэрміны ў дысертацыі патрабуюць большай прапрацоўкі. Дысертант прытрымліваецца тоеснасці і ўзаемазамяняльнасці тэрмінаў «палітычная і маёмасная эліта», «арыстакратыя» і «магнатэрыя» (с. 6). Між тым, саму дэфініцыю "магнаты" пажадана было б даць больш разнабакова. Дысертант характарызуе гістарыяграфічную дыскусію вакол вызначэння гэтай сацыяльнай групы. Тут было б карысным прыгадаць і катэгорыі феадалаў для XVI ст., прапанаваныя М.Ф. Спірыдонавым ("Закрепощение крестьянства Беларуси (XV-XVI вв.)". Минск: Навука і тэхніка, 1993). Аўтар манаграфіі даваў пазітывісцкіе крытэрыі розных катэгорый, зыходзячы з статыстыкі па Попісах войска ВКЛ 1528 і 1567 гг. Магнаты, паводле М.Ф. Спірыдонава, вылучаліся з агульнай масы землеўладальнікаў тым, што "ставілі" ў войска 100 і более "коней" (мабілізацыйна-ўліковая адзінка).

2. Распавядаючы пра зараджэнне традыцыі адукацыйных падарожжаў, варта было б указаць, што ў Вялікім Княстве Літоўскім яна мае вытокі яшчэ ў XV ст. Яскравым прыкладам тут можа быць лёс Солтана Аляксандравіча

(?-1495), які ў пазнавальна-адукацыйных мэтах наведаў Свяшчэнную Рымскую імерыю, Рым, Сіцылійскае каралеўства, Кастылію, Партугалію.

3. Аўтар даследаваня робіць акцэнт на значнасць эпохі Адраджэння (Рэнесансу) у актывізацыі працэсаў рэфармавання адукацыі ў Заходняй Еўропе і ва ўзнікненні сярод эліт ВКЛ практыкі адукацыйных падарожжаў (напрыклад, с. 7). Між тым, для сярэдзіны XVI ст. найбольшае значэнне меў фактар канфесійнай (пратэстанцкай) адукацыі, таму варта было б казаць у большай ступені пра ўплывы Рэфармацыі на ўзнікненне сталай традыцыі адукацыйных падарожжаў.

4. Надзвычай каштоўнымі з'яўляюцца дадаткі да дысертацыі, вынесеныя ў асобны том. У дадатках прадстаўлены як зводныя табліцы дакументаў, так і копіі саміх лістоў і дыярыушаў. Маюцца спасылкі на архівы, у якіх захоўваюцца гэтыя дакументы. Між тым не пазначана, ці былі тыя ці іншыя дакументы ўжо апублікаваныя. Падобныя звесткі значна падвышаюць крыніцазнаўчую вартасць працы.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Дысертацыя Калтачэнка Аліны Ігараўны "Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст." з'яўляецца завершаным, самастойна выкананым даследаваннем, якое сведчыць аб асабістым укладзе навукоўца ў распрацоўку праблемы адукацыйных стратэгій эліт Вялікага Княства Літоўскага ў XVI-XVIII стст. Навуковая кваліфікацыя А. І. Калтачэнка адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

**Заключэнне**

Дысертацыйнае даследаванне "Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст." адпавядае патрабаванням «Положения о присуждении ученых степеней и присвоении ученых званий в Республике Беларусь", а яе аўтар – Калтачэнка Аліна Ігараўна, – заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук за:

- Распрацоўку канцэпцыі адукацыйных стратэгій эліт Вялікага Княства Літоўскага ў XVI-XVIII стст., іх адаптацый у адпаведнасці з развіццём уласных адукацыйных структур у Вялікім Княстве Літоўскім;
- Абгрунтаванне размежавання для эліт Вялікага Княства Літоўскага ў XVI-XVIII стст. дзвюх тыпаў адукацыйных падарожжаў:

«peregrinatio academica» ці «навуковую перэгрынацыю» і «grand tour» ці «гранд тур»;

- Выяўленне сувязі замежных адукацыйных практык эліт Вялікага Княства Літоўскага ў XVI-XVIII стст. з палітыкай канфесіяналізацыі ў Заходняй Еўропе і ВКЛ і з працэсамі рэфармавання ўніверсітэтаў у Заходняй Еўропе;
- Устанаўленне сувязі паміж адукацыйнымі падарожжамі і практыкамі рэлігійнай канверсіі для часткі эліт Вялікага Княства Літоўскага ў XVI-XVII стст.;
- Выяўленне, сістэматызацыю і ўвядзенне ў навуковы абарот новых наратыўных пісьмовых крыніц.

Афіцыйны апанент

кандыдат гістарычных навук, дацэнт,

вядучы навуковы супрацоўнік

аддзела гісторыі Беларусі IX—XVIII стст.

і археаграфіі

Інстытута гісторыі НАН Беларусі

А. І. Дзярновіч

14.01.2026.

Подпіс Дзярновіча А. І.
Вяд. спецыяліст
«14» 01 26

Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» * Рэспубліка Беларусь, г. Мінск
РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ